## Надзея ПАРЧУК

# Трагічная дата

(11 верасня 1942 года)

*Плыў верасень шчодры і шчыры*
*Над вёскай Драмлёва ў той дзень.*
*І сонца, сабраўшы ўсе сілы,*
*Лілося святлом да людзей.*

*Але нечакана тым ранкам*
*Варожы ўварваўся атрад —*
*І вогнішча страшнай маланкай*
*Шугнула над стрэхамі хат.*

*Гарэла кустоўе шыпшыны,*
*Гарэлі ў хлявах жыхары.*
*Надзейкі, Сяргейкі і Ніны*
*Крычалі, аж чулі бары.*

*Пустошылі склепы і свірны,*
*Дабро павыносілі з хат,*
*Расстрэльвалі дзетак нявінных —*
*Здавольваўся смерцю вар'ят.*

*Ад болю зямля галасіла,*
*У дыме гібела сяло —*
*Фашысцкае нечысці сіла*
*Сваё агаліла нутро.*

*Якія ж іх маці радзілі*
*І катамі быць нараклі?*
*Забойцаў пад сэрцам насілі —*
*Крывёю наш край залілі.*

*...Цяжкія мінулі часіны.*
*Па знішчаных сэрца баліць.*
*Мы помніць іх вечна павінны*
*І ў Бога аб міры прасіць.*